**Сачыненне “Маленькі ўтульны гарадок”**
**Чарняўская Паліна**
**ДУА “Шпакоўшчынская базавая школа Полацкага раёна”, 6 клас**

Перад маімі вачыма паўстае маленькі ўтульны гарадок - зялёны ад дрэў, духмяны ад водару кветак, ціхі і спакойны…Нечым нават родны. А трапілі вы ў Полацк! Усё навокал тут захапляе!

Вечар. На вуліцах цішыня і спакой, толькі дзе-нідзе свецяцца вокны. За кожным акном сваё жыццё: хто чытае, хто глядзіць цікавы фільм, хто вырашае нейкія асабістыя праблемы, а хто проста заняты хатнімі справамі. І сам горад жыве сваім жыццём.

Я вырашыла знайсці адказ на пытанне: “Чаму гэты маленькі гарадок стаў такім блізкім і родным?” А давайце пройдземся вуліцамі горада.

Сквер у цэнтры горада мірна і ціха шапаціць галінкамі магутных дрэў: “Мы вітаем цябе, жахар!” І раптам з прыцемку дрэў паўстае задуменная постаць. Чаму так уважліва гэты чалавек-помнік пазірае на горад? У яго руках кніга. Ведаю гэту асобу. Першадрукар. А яшчэ тут ёсць музеі, помнікі славутым людзям беларускай зямлі, карцінная галерэя…

Паступова наступае ранак. Першыя промні сонца толькі-толькі бліснулі над зямлёй, як горад засвяціўся чысцінёй і светам, светам мінулых вякоў і стагоддзяў.

А вось і помнік Святой Еўфрасінні. Адразу адчуваеш тую энергію, моц абароны, якія ідуць ад помніка. Энергія Святой распаўсюджваецца на ўвесь горад, на ўсю такую загадкавую краіну. Краіну, у якой ёсць такое духоўнае і гістарычнае багацце – горад Полацк. Горад, у якім людзі могуць спакойна спаць і не хвалявацца за сваю бяспеку. Горад, у якім захавалася і жыве даўніна, сама гісторыя. Горад, у якім памятаюць і з пашанай адносяцца да салдатаў мінулай вайны. Горад, дзе кожная сцяжынка, кожная вуліца захоўвае ў сабе цікавыя звесткі, і не проста захоўвае, а дзеліцца сваімі здабыткамі. Горад, у якім жывуць добразычлівыя людзі.

“Няхай людзі шануюць і берагуць сваё багацце: маленькія ўтульныя гарады, зялёныя скверы, помнікі!”– падумала я, гледзячы на прыгажосць ракі Дзвіна, якая захоўвае ў сваіх хвалях саму гісторыю нашай дарагой краіны.